На кантролі

# «МЫ ПАВІННЫ ЗРАБІЦЬ УСЁ, КАБ СТАЛІЦА ВЫГЛЯДАЛА СУЧАСНА, ЭСТЭТЫЧНА І ДОБРАЎПАРАДКАВАНА»

## Наталля КАЧАНАВА правяла нараду па пытаннях рэкламы

**Да гэтай тэмы Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў горадзе Мінску, звяртаецца рэгулярна. Ні адна нарада з прадстаўнікамі Мінгарвыканкама не абыходзіцца без акцэнтавання ўвагі на эстэтычным абліччы сталіцы, у тым ліку ў пытаннях вонкавай рэкламы. Пры гэтым спікер скіроўвае адказных асоб не толькі да прыгажосці і гарманізацыі рэкламнай прадукцыі, але і яе якаснага тэматычнага напаўнення.**

Размова падчас нарады ішла не толькі аб сталіцы, але і аб Мінскай вобласці — у часткі, якая датычыцца Мінскай кальцавой дарогі. «Гэта задача не новая — па эстэтызацыі гарадскога асяроддзя, вонкавай рэкламе, асвятленні, падсветцы, добраўпарадкаванні, — удакладніла Наталля Качанава. — Перад намі стаяць вельмі сур'ёзныя задачы, бо мы разумеем, што горад Мінск — гэта сталіца, аблічча нашай краіны, і таму мы павінны зрабіць усё, каб сталіца выглядала сучасна, эстэтычна і добраўпарадкавана для свайго насельніцтва».

Наталля Качанава нагадала, што задачы пастаўлены кіраўніком дзяржавы і іх трэба выконваць. «Да 1 мая мы павінны поўнасцю навесці парадак з вонкавай рэкламай у Мінску, — канкрэтызавала спікер. — Не проста з устаноўкай білбордаў і яшчэ нейкіх канструкцый, а менавіта са зместам рэкламы. У сталіцы праходзяць сур'ёзныя мерапрыемствы. Рыхтуемся да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пачынае сваю работу Усебеларускі народны сход, шэраг іншых мерапрыемстваў, якія будуць праводзіцца і праводзяцца ў нашай краіне. Таму, вядома, і змест рэкламы павінен адлюстроўваць наша жыццё — тое, што адбываецца ў нашай краіне».

Наталля Качанава звярнула ўвагу на тое, што гэтае пытанне знаходзіцца на кантролі ў Савеце Рэспублікі. «Мае калегі практычна кожны тыдзень праязджаюць горад у розных яго частках, — паведаміла спікер. — Пачнём з таго, што мы пакажам, якая рэклама ў нас на сённяшні дзень ёсць і дзе ёсць яшчэ нейкія праблемы. Але 1 мая — для ўсіх нас час, калі мы павінны гэтую работу завяршыць».

Дарэчы, парламентарыі ажыццявілі вялікую работу ва ўдасканаленні заканадаўства па пытаннях рэкламы. Найважнейшыя праблемныя моманты, якія даўно патрабавалі заканадаўчага ўрэгулявання, разглядаліся на пасяджэнні экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі. Праект Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях рэкламы» быў адобраны членамі Савета Рэспублікі на пасяджэнні 11-й сесіі Савета Рэспублікі 29 снежня 2023 года. Яго асноўныя палажэнні ўступяць у сілу 11 ліпеня 2024 года.

У прыватнасці, павялічыцца час для размяшчэння рэкламы ў радыё- і тэлепраграмах, якія трансліруюцца з 18.00 да 22.00, зняецца забарона на размяшчэнне рэкламы ў выглядзе накладання, у тым ліку спосабам «бягучая радка», у перадачах працягласцю менш за 15 хвілін. Мяняюцца падыходы да ўзгаднення вонкавай рэкламы і рэкламы на транспарце: цяпер яна будзе ўзгадняцца з мясцовымі органамі ўлады. Удакладняюцца патрабаванні па размяшчэнні рэкламы на помніках архітэктуры і іншых аб'ектах нерухомай матэрыяльнай спадчыны. Уводзіцца забарона на аказанне паслуг па размяшчэнні рэкламы ў інтэрнэце юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія не ўключаны ў Рэестр рэкламараспаўсюджвальнікаў і інш.

Як паведаміла ў размове з журналістамі **дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Мінскрэклама» Таццяна КАЛІЦІНА**, на сёння ў Мінску дзейнічае больш як 20 буйных сеткавых аператараў, вялікая колькасць шчытавых рэкламных канструкцый і канструкцый, прызначаных для размяшчэння вонкавай рэкламы. «Гэтае пытанне — штодзень на кантролі ў горадзе, маніторынг праводзіцца сістэматычна, — удакладніла яна. — Безумоўна, выяўляюцца парушэнні, якія датычацца як тэхнічнага стану шчытавых рэкламных канструкцый, так і якасці і актуальнасці сюжэтаў вонкавай рэкламы. Гэтаму ўдзяляецца ўвага. Пры выяўленні парушэння выносіцца прадпісанне, адпаведна, кантралюецца да ліквідацыі парушэння».

Таццяна Каліціна заўважыла, што змяненні ў заканадаўства аб рэкламе прымаліся выключна на падставе практычнай дзейнасці. Па яе словах, новаўвядзенні як дадуць магчымасць упарадкаваць усю вонкавую рэкламу ў горадзе Мінску, так і прывесці яе ў годны стан, які прэзентуе сталіцу.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю Уладзіміра Мікалаевіча ПАЛУЯНА, былога міністра па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь, і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Святлане Уладзіміраўне Барташ у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

Заканадаўчыя навацыі

# СПРОШЧАНАЯ ПЕРАРЭГІСТРАЦЫЯ І НОВЫЯ ВІДЫ ФІНАНСАВАЙ ПАДТРЫМКІ

## Тлумачым падрабязнасці падпісанага Прэзідэнтам Закона «Па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці»

**Як ужо паведамляла «Звязда», падпісаны днямі кіраўніком дзяржавы дакумент устанаўлівае абноўленую архітэктуру прадпрымальніцтва і прадугледжвае дзве катэгорыі, якія займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю: юрыдычныя і фізічныя асобы. Да юрыдычных асоб аднесены малыя арганізацыі з колькасцю работнікаў да 100 чалавек, сярэднія — да 250 супрацоўнікаў і буйныя — звыш 250 чалавек. У катэгорыю фізічных асоб уключаны рамеснікі, уладальнікі аграэкасядзіб, самазанятыя, індывідуальныя прадпрымальнікі.**

**Як будуць на справе рэалізоўвацца нормы закона, расказалі эксперты.**

### З індывідуальнага прадпрымальніка ў юрыдычную асобу — за адзін дзень

Як звярнуў увагу **міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР**, з зацвярджэннем закона будзе ўкараненых і ўступіць у сілу шэраг чаканых з боку прадпрымальніцтва, у тым ліку і рэгулятараў, новаўвядзенняў, якія створаць дадатковыя ўмовы для маштабавання бізнесу. «У гэтым кірунку мы адпрацоўвалі, каб бізнес мог павялічваць свае вытворчасць, гандаль і паслугі дзякуючы прынятаму закону, — дадаў ён. — У першую чаргу мы глядзелі на тое, каб стварыць умовы для стымулявання пераходу ў юрыдычную асобу».

Па словах міністра, законам прадугледжана магчымасць перарэгістрацыі ў юрыдычную асобу за адзін дзень. «Гэта не проста тэхнічная перарэгістрацыя, — удакладніў ён. — За будучай юрыдычнай асобай застануцца ўсе дзейныя на той момант дазвольныя дакументы: сертыфікаты, ліцэнзіі і іншае. У тым ліку ёсць магчымасць у паскораным рэжыме перарэгістраваць свой разліковы рахунак у банку. Другая стымуляцыйная мера — захаванне для юрыдычных асоб магчымасці спрошчанага адміністравання па розных кірунках. Напрыклад, справаводства можна будзе весці як і раней».

Кажучы аб дадатковых мерах падтрымкі, прадугледжаных законам, Юрый Чабатар заўважыў, што будзе арганізавана выдача грантаў з боку мясцовых органаў кіравання або паручальніцтва па пазыках. Ён лічыць, што такія новаўвядзенні істотна падштурхнуць бізнес да таго, каб пераходзіць у форму юрыдычнай асобы.

### «Захоўваюцца льготы — захоўваюцца і абавязкі»

На стадыі распрацоўкі законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці» прайшоў шырокае грамадскае абмеркаванне з прыцягненнем практычна ўсіх катэгорый бізнес-супольнасці: ад індывідуальных прадпрымальнікаў да прадстаўнікоў малога, сярэдняга і буйнога бізнесу. Як паказалі вынікі гэтага абмеркавання, рэформа бізнес-супольнасцю ўспрымаецца канструктыўна.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Віктар НІКАЛАЙКІН** лічыць Закон «Па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці» своечасовым і вельмі важным дакументам. «З моманту прыняцця дзеючых цяпер законаў, якія рэгулююць прадпрымальніцкую дзейнасць, прайшоў пэўны час, — заўважыў ён. — За гэты перыяд, з аднаго боку, выявілася шэраг пытанняў, якія з пункту гледжання правапрымяняльнай практыкі патрабавалі змяненняў. З іншага боку, прадпрымальнікі, у тым ліку індывідуальныя, імкнуцца да таго, каб іх бізнес быў паспяховы і развіваўся, аднак на пэўнай стадыі дзейныя сёння законы пачынаюць тармазіць далейшае развіццё, маштабаванне гэтага прадпрымальніка».

Па словах дэпутата, новым законам прадугледжана зняцце шэрагу абмежаванняў, якія да нядаўняга часу не дазвалялі прадпрымальнікам развівацца далей. У прыватнасці, індывідуальны прадпрымальнік, гадавая выручка якога складае звыш 500 тысяч рублёў, не мае права займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю. Акрамя таго, абмежаванні датычацца і колькасці работнікаў, якіх прадпрымальнік можа выкарыстоўваць у наём. «Згодна з дзейным заканадаўствам, яму трэба пераходзіць у іншую арганізацыйна-прававую форму — гэта значыць ствараць юрыдычную асобу, — патлумачыў Віктар Нікалайкін. — Для таго каб гэта зрабіць, спачатку трэба закрыць індывідуальнае прадпрымальніцтва. Гэта прадугледжвае вялікую колькасць працэдур, таму самі бізнесмены кажуць, што не трэба ісці гэтым шляхам, бо некалькі месяцаў, а то і год-два будзеш хадзіць па інстанцыях, каб закрыць сваё ІП. А потым яшчэ трэба будзе ствараць юрыдычную асобу».

Новы Закон «Па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці», па словах парламентарыя, не толькі стварае ўмовы для развіцця бізнесу, але і забяспечвае магчымасць справядлівай канкурэнцыі для ўсіх прававых форм бізнесу. «Закон прадугледжвае надзяленне паўнамоцтвамі ўрада зацвярджаць пералік відаў паслуг і работ, якія будзе мець права выконваць індывідуальны прадпрымальнік, — канкрэтызуе Віктар Нікалайкін. — Калі ты знаходзішся ў гэтым спісе, можаш і далей спакойна працаваць у якасці ІП. Калі даход перавышае ўстаноўленыя 500 тысяч рублёў за год, то ты можаш напісаць заяву і на працягу сутак па спрошчанай, зразумелай працэдуры перайсці з індывідуальнага прадпрымальніка ў юрыдычную асобу. Пры гэтым за табой захоўваюцца ўсе льготы, банкаўскія рахункі, сертыфікаты, дазволы, якія ты меў як ІП. Аднак у той жа час за табой захоўваюцца адказнасць і абавязацельствы перад дзяржавай, якія ты ўжо ўзяў на сябе як ІП, або перад пэўнымі суб'ектамі гаспадарання. Гэта справядліва: захоўваюцца льготы — захоўваюцца і абавязкі».

Як падкрэсліў старшыня Пастаяннай камісіі, той, хто хоча далей развівацца, безбалюча ажыццявіць пераход за суткі і будзе далей працаваць, але ўжо на правах юрыдычнай асобы. «Да канца 2025 года трэба будзе вызначыцца: або пераходзіць у юрыдычную асобу па спрошчаным механізме, або заставацца ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, але выконваць іншыя віды работ, якія будуць у пераліку ўрада, — канкрэтызаваў ён. — Такім чынам, новаўвядзенні прадыктаваны правапрымяняльнай практыкай, ствараюць роўныя ўмовы для ўсіх форм бізнесу і даюць магчымасць бізнесу ўмацоўвацца, развівацца і рухацца наперад».

Па словах **члена Савета Рэспублікі Валянціна БАЙКО,** заканадаўства аб прадпрымальніцкай дзейнасці з'яўляецца самай мабільнай часткай грамадзянскага заканадаўства любой дзяржавы. «Гэта і зразумела: прадпрымальніцтва — ініцыятыва, пастаянныя змены, навацыі і пошук новых магчымасцяў, — патлумачыў ён. — Заканадаўства аб прадпрымальніцкай дзейнасці ў Беларусі прайшло некалькі паслядоўных этапаў станаўлення і працягвае ўдасканальвацца. Лагічным завяршэннем чаргавага цыкла трансфармацыі як самога інстытута «прадпрымальніцтва», так і нарматыўнага рэгулявання прадпрымальніцкай дзейнасці стала прыняцце Закона «Па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці»».

Сенатар нагадаў, што адной з найважнейшых умоў паспяховага развіцця прадпрымальніцкай ініцыятывы з'яўляецца забеспячэнне роўных умоў і татальнае выкананне ўстаноўленых правілаў. «У сувязі з гэтым уяўляецца, што карэкціроўка правілаў ажыццяўлення індывідуальнага прадпрымальніцтва будзе садзейнічаць вырашэнню менавіта гэтых задач, — адзначыў Валянцін Байко. — Законам, з аднаго боку, уводзіцца пэўны ліміт на віды дзейнасці, якімі можна будзе займацца без утварэння юрыдычнай асобы (і па гэтай прычыне мець некаторыя перавагі перад юрыдычнымі асобамі); з іншага боку, пашыраюцца магчымасці для малых форм прадпрымальніцтва па атрыманні дзяржаўнай падтрымкі на вядзенне бізнесу. Калі ўсё атрымаецца, як задумана распрацоўшчыкамі ўжо прынятага закона (а няма бачных прычын да таго, каб нешта не было рэалізавана), то ў выніку грамадства атрымае больш транспарэнтнае бізнес-асяроддзе, рост даходаў бюджэту і максімальна цывілізаваныя формы адносін па лініі «бізнес — грамадства — дзяржава».

**Вераніка КАНЮТА.**